ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 54 (1323) | СУБОТА, 7-га сакавіка 1931 г.

ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 60 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ Х.

Кошт асобнага №—2 кап.

II ПЛЕНУМ ЦК ЛКСМБ

ПЕРАНОСІЦЦА
на 13 сакавіка 1931 г.

З НАСТУПНЫМ ПАРАДКАМ ДНЮ:

1. Аб становішчы ўдзелу ЛКСМБ у вясеньняй пасеўнай кампаніі і колектыв зацыі (дакл. т. Паляко̆ў).
2. Аб рабочым забесьпячэньні і задачах ЛКСМБ (дакл. т. Гуткін).
3. Аб вайсковай рабоце ЛКСМБ (дакл т. Гузікаў).
4. Паход комсамола за якасьць і тэхніку. (Юрк'янец).
5. Выбары ЦКК ЛКСМБ

На пленум выклікаюцца сябры, кандыдаты ЦК і рэвізійнай камісіі, а таксама асобна выкліканыя сэкратары райкомаў.

С-кратар ЦК ЛКСМБ ПАЛЯКОЎ.

Справа контр-рэволюцыйнай організацыі меншавікоў

СТАЎКА НА АБШАРНІЦКА-КАПІТАЛІСТЫЧНУЮ РЭСТАЎРАЦЫЮ РАСІІ

Штыхамі інтэрвэнцкіх армій меншавікі рыхтавалі зьнішчэньне краіны пролетарскай дыктатуры

Працоўныя масы сусьвету недапусьцяць патапіць у крыві Саюз ССР

АБ ПРОЦЭСЕ „САЮЗНАГА БЮРО“

Пастанова ЦК УсеЛКСМ

Выкрыцьцё шкодніцкай інтэрвэнцыянісцкай дзейнасьці меншавікоў і іх „Саюзнага Бюро“ ЦК РСДРП (м) выклікала вялічэзнае абурэньне і новы вялізарны ўздым політычнай і вытворчай актыўнасьці працоўных СССР вакол УсеКП (бальшавікоў)

1. ЦК УсеЛКСМ даручае ўсім організацыям УсеЛКСМ шырока разгарнуць масавую работу сярод працоўнай моладзі па растлумачэньню сутнасьці процэсу, выкрыцьцю шкодніцкай работы інтэрвэнцыянісцкіх замыслаў агентаў сусьветнай буржуазіі—ІІ інтэрнацыяналу, соцыял-фашыстых, замежнай дэлегацыі ЦК меншавікоў і „Саюзнага бюро“ ЦК РСДРП (м).

Уся прапагандысцкая работа ў сувязі з процэсам „Саюзнага бюро“ ЦК РСДРП(м) павінна праводзіцца на аснове глыбокага растлумачэньня шкодніцкай ролі меншавізму ва ўсёй гісторыі рабочага руху, выкрыцьця таго, што за час свайго існаваньня меншавізм быў выказьнікам чужых пролетарыяту клясаў, з якімі змагаўся бальшавізм, і што, „называючы сабе соцыялістымі, меншавікі і эсэры на справе—пасобнікі белых, пасобнікі абшарнікаў і капіталістых“ (Ленін).

Непасрэдным вынікам масавай політычнай работы ў сувязі з процэсам „Саюзнага бюро“ ЦК РСДРП (м) павінна зьявіцца яшчэ большая мобілізацыя комсамольцаў, працоўнай моладзі на выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады, соцыялістычнае спаборніцтва, барацьба за генэральную лінію партыі, супроць правых і „левых“ опортуністых, якія імкнуцца накіраваць нас на шлях капіталістычнай рэстаўрацыі.

2. Уключыць пытаньні аб процэсе „Саюзнага бюро“ ЦК РСДРП(м) ва ўсе політпадручнікі і выдаць ў дэкадны тэрмін спэцыяльныя выпускі для распрацовак на гуртках бягучай політыкі ў горадзе і вёсцы. Зацьвердзіць аўтарамі гэтых выпускаў т. т. Сямашка і Стальскага.

Прасіць інстытут імя Леніна ў трохдзенны тэрмін падрыхтаваць спэцыяльную мэтодраспрацоўку аб партыі меншавікоў па шасьцітомніку Леніна для актыву УсеЛКСМ.

Даручыць ОПТУ ЦК і дэлегацыі УсеЛКСМ і ІККІМ у трохдзённы тэрмін падрыхтаваць мэтодраспрацоўку для масавых гутарак і сеткі політадукацыі аб ролі праціўніцкіх организацый, у прыватнасьці СІМ, у падрыхтоўцы інтэрвэнцыі СССР.

3. Адзначаючы пасіленьне цягі працоўнай моладзі ў УсеЛКСМ, прапанаваць усім організацыям зьвязаць масавую політычную работу па выкрыцьцю меншавізму з шырокай масавай вярбоўкай рабочай і колгаснай моладзі ў комсамол.

Прапанаваць усім камітэтам і ячэйкам УсеЛКСМ безадкладна афармляць усе заявы аб прыёме. Неабходна разгарнуць шырокую работу па ахопу нова ўступіўшых політыка-выхаваўчай работай у гуртках, школах, ударным рухам і соц.спаборніцтвам.

4 Даручыць усім комсамольскім газэтам шырока асьвятляць процэс, ход масавай вярбоўкі ў комсамол і новы ўздым політычнай і вытворчай актыўнасьці моладзі.

Ранішняе паседжаньне 5 сакавіка

Допыт падсуднага Тайтэльбаўма

Працягваецца допыт падсуднага Тайтэльбаўма. Яго цак заньні праліваюць яркае сьвятло на ад осіны замежнай дэлегацыі меншав коў і ІІ інтэрнацыяналу цалкам да пы аньня аб інтэрвэнцыі. Тайтэльбаўм паказвае, што консолідацыя меншавіцкіх сіл для работы ў СССР пачалася ў Бэрліне яшчэ з 1925 году. Там ён належаў да меншавіцкай ячэйкі Бэрлінскага гандлёвага прадстаўніцтва.

На паасобных членаў ячэйкі ўскладаўся абавязак вербаваць новых членаў организацыі з прыяжджаючых заграніцу савецкіх работнікаў,—былых меншавікоў. Акрамя таго, члены ячэек павінны былі дастаўляць матар'ялы і корэспондэнцыі для „Социалистического Вестника“. Зноў завербаваным у организацыю савецкім работнікам давалася катэгорычная дырэктыва па звароце ў СССР усякімі спосабамі перашкодзіць правядзеньню намечаных савецкай уладай мерапрыемстваў, якія маглі спрыяць росту народнай гаспадаркі. Ім-жа прадпісвалася забясьпечваць троцкістых тэндэнцыйна палабранымі матар'ямі для друку, якія-б маглі дыскрэдытаваць генэральную лінію УсеКП(б).

З паасобных спатканьняў з кіраўнікамі меншавіцкага замежнага цэнтру, Тайтэльбаўм асабліва значэньне надае свайму спатканьню з Гарві раньняй вясною 1927 году ў сябе на кватэры ў Бэрліне.—„Па сутнасьці-ж інтэрвэнцыя ёсьць адзіны шлях, які забясьпечыць магчымасьць устанавіць „Дэмократычны лад“ у СССР“,—даводзіў Гарві.

Увесну 1928 году Тайтэльбаўм спаткаўся ў Стокгольме з Данам, які прыяжджаў на зьезд швэдзкай соцыял-дэмократыі. Дан перадаў Тайтэльбаўму, што пункт погляду Гарві на інтэрвэнцыю сустракае ўсё большае спачуваньне сярод дэлегацый ІІ інтэрнацыяналу.

Установкі замежнага меншавіцкага цэнтру і ІІ інтэрнацыяналу на інтэрвэнцыю знашлі сваё адлюс раваньне ў тых дырэктывах, якія год пасьля былі нераданы для „саюзнага бюро“ Тайтэльбаўму, калі апошні праездам з Стокгольму ў СССР зноў апынуўся ў Бэрліне.

Ў дадатак да пісьмовых дырэктыў Тайтэльбаўму даны былі растлумачэньні, падкрэсьліўшы, што само становішча рускай дэлегацыі ў другім інтэр ацыянале ў далейшым будзе залежаць ад ступені пасьпяховасьці дэз рганізатарскай дзейнасьці ўнутры СССР для забясьпечаньня бесхва обнага праходжаньня інтэрвэнцыі.

Допыт падсуднага Якубовіча

Падсудны Якубовіч загадваў кіраўніцтвам прамтавараў Наркомгандлю СССР. У сваіх паказаньнях Якубовіч раскр вае перад судом доўгую сетку злачынай шкодніцкай дзейнасьці контрр волюцыйн й меншавіцкай организацыі ў Наркомгандлі. Асноўнай формай шкодніцтва было перазабясьпечаньне пр мтаварамі паасобных раёнаў і незабясьпечаньне другіх раёнаў. Меншавікі праводзілі свой шкоініцкі плян і ў галіне фінансаваньня спажывкооперацыі. Шляхам падтасоўваньня фактаў яны дабіліся правядзеньня нізкіх лічбаў крэдытаваньня нізавой коопэрацыі, што д лёка ня забясьпечыла патрабаваньнаў коопэрацыі. У выніку сродкі зьбіваліся туды, дзе яны былі менш ўсяго патрэбны.

Шкодніцкая организацыя Наркомгандлю мела вялікія разгалінаваньні ў розных органах: кіраўніцтве прамтаварамі, п янавай групе, хл бафуражным кіраўніцтве Наркомгандлю СССР, гандлёвай сэкцыя Дзяржпляну, меншавікі—члены праўленьня Цэнтрасаюзу—Пятунін і Некрасаў, шкоднікі ў тэкстыльным, гарбарным і мэталюргічным сындыкатах. Для дырэктыўных паказаньняў Якубовіч выклікаў д сябе шкоднікаў з розных организацый, заслухоўваў іх інформацыі, даваў ім конкрэтныя даручэньні.

Паказаньні сьведкі Іоффэ

Сьведка Іоффэ, працаваўшы ў шкодніцкай ячэйцы ўсесаюзнага тэкстыльнага аб'яднаньня, паказвае:

— Усе шкодніцкія акты, да якіх я меў дачыненьне ў якасьці простага ўдзельніка ці супольніка, адносіліся к дэ організацыі забясьпечаньня рынку тэкстыльнымі вырабамі.

Галоўнай работай ячэйкі было шкодніцкае пляніраваньне завозу тэкстыльных выраба.

Наогул галоўным мэтодам шкодніцтва ВТО зьяўлялася заведама няправільнае складаньне завозных плянаў. У прамысловыя рабочыя раёны тэкстыльныя вырабы адпраўляліся шкоднікамі ў недастатковай колькасьці. Шкодніцтва ў галіне асортымэнту выявілася ва ўключэньні ў вытворчыя програмы ня тых сартоў тканіны, на якія насельніцтва мае попыт. У зімовыя месяцы на рынак выкілаўся летні тавар, летам—зімовы і г. д. Усё гэта прыводзіла да значнага непарадку ў рабочым забясьпечаньні.

Сьведка ўказвае, што заведама няправільнае складаньне плянаў завозу праходзіла пры дапамозе меншавікоў шкоднікаў з Наркомгандлю, у прыватнасьці Залкінда і Якубовіча.

Допыт падсуднага Залкінда

Прадстаўнік дзяржаўнага абвінавачваньня запытаў Залкінда:

— Як было вядома аб тых шкодніцкіх актах, якія ўтвараліся кіраўніцтвам прамтавараў Наркомгандлю і ВТО?

— Так,—адказвае Залкінд,—аб гэтых актах мне было вядома, як пацьвярджаюць паказаньні падсуднага Якубовіча і сьведкі Іоффэ.

На пытаньне дзяржаўнага абвінаваўца Залкінд адказвае, што яго конкрэтная шкодніцкая работа адбывалася ў галіне пляніраваньня таваразвароту.

— Наша ўстаноўка была ў тым,—п казвае далей Залкінд,—каб максімальна форсаваць разьвіцьцё лёгкай прамысловасьці і ў той-жа час затрымліваць рост прамысловасьці цяжкай.

Паміж іншым, шкоднікі з Наркомгандлю станавіліся часам і на іншы шлях: знарок пераялічваць загатоўчыя пляны.

— Мы,—гаворыць Залкінд,—ведаючы загадзя, што павялічаны плян ня будзе выкананы, хацелі паказаць бясьсільле нашых плянавых і рэгулюючых органаў.

У галіне політыкі сельска-гаспадарчых цэн „саюзнае бюро“ стаяла, як вядома, на пун це погляду ўзмацненьня інд відуальнай сялянскай гаспадаркі. І вось, ад ым з такіх мэтодаў стымуляваньня аднаасобнікаў мы высунулі значнае павышэньне сельска-гаспадарчых цэн. Асноўная ўстаноўка, якую мы праводзілі гэта была ўстаноўка на разгортваньне капіталістычных адносін у горадзе і вёсцы, адсюль усямернае процідзеяньне ўсім мерапрыемствам савецкага ўраду.


Допыт падсуднага Пятуніна


Падсудны Пятунін адзначае, што шкодніцтва ў Цэнтрасаюзе ішло па 5-ці асноўных ліні х: па зьменшаньню фінансавых рэсурсаў Цэнтрасаюзу і ўсёй сыстэмы спажыв. коопэрацыі, па затрымцы мобілізацыі сродкаў насельніцтва (паенакапленьне і г. д.), па лініі процідзеяньня правядзеньню крэдытнай рэформы і правільнаму разьмеркаваньню крэдыту ў коопэрацыйнай сыстэме і, нарэшце, шкодніцкія дзеяньні, якія перашкаджалі вычэрпваць цэнтрасаюзаўскія сродкі на індустрыялізацыю краіны.

Вячэрняе паседжаньне 5 сакавіка

Допыт сьведкі Некрасава

Дапытваецца сьведка Некрасаў. Ён мае вялікі стаж служэньня контррэвалюцыі.





На здымку—падсудныя

На працягу 12 год, да 3 ліпеня 1917 году, ён быў членам кадэцкай партыі са дня яе існаваньня. У 1909 годзе—член яе ЦК. Акрамя гэтага, ён быў членам дзяржаўнай думы, а потым тав. старшыні гэтай думы, тав. старшыні часовага камітэту дзяржаўнай думы і членам ураду.

Паступіўшы на савецкую службу, ён нікольні ні зьмяніў свае погляды. Таму, працуючы ў Цэнтрасаюзе ў якасьці члена яго кіраўніцтва, ён з ахвотай прыняў у пачатку 1928 году прапанову аб шкодніцкай рабоце ад члена меншавіцкай контрэволюцыйнай организацыі Пятуніна. Шкодніцкая работа меншавіцкай організазацыі Цэнтрасаюзу, у прыватнасьці Пятуніна і Некрасава, заключалася ў тым, каб зрываць і працідзейнічаць правядзеньню клясавай лініі савецкай улады у галіне забясьпечаньня насельніцтва прамтаварамі. Шкоднікі накіроўвалі тавары пераважна ў тыя раёны дзе кулацтва і заможныя пласты насельніцтва складаюць больш ці менш значны процант. Гэта балюча біла па хлебазагатоўках і забясьпечаньню прамысловых цэнтраў.

Допыт падсуднага Гінзбурга

Пасьля допыту сьведкі Некрасава суд выклікае падсуднага Гінзбурга.

Гэты шкоднік у 26—27 годзе, будучы намесьнікам старшыні прампляну і старшынёй асо ай камісіі па складаньню пяцігодкі прамысловасьці, распрацаваў такую пяцігодку, якая прывяла-б да зрыву індустрыялізацыі краіны і значнага зьніжэньня жыцьцёвага ўзроўню рабочае клясы.

Гінзбург у сваіх афіцыйных выступленьнях усяляк імкнуўся паказаць шляхам нават фальсыфікацыі вывадаў з конъюнктурных аглядаў, нерэальнасьць узятых савецкай уладай тэмпаў. Гінзбург даваў няправільныя шкодніцкія экономічныя ацэнкі распрацоўваючым проэктам завозаў мэталь-прамысловасьці. Так ён імкнуўся затрымаць будаўніцтва і сарваць пашырэньне магнітагорскага і сталінградзкага трактарнага заводу.

Допыт падсуднага Волкава

Выкліканы пасьля Гінзбурга на допыт Волкаў паведамляе аб сваёй рабоце ў галіне фінансаваньня прамысловасьці. Так ён ужываў усе захады сарваць фінансаваньне машынабудаўнічай прамысловасьці, што павінна было прывесьці да згортваньня індустрыялізацыі краіны. Контррэволюцыйная меншавіцкая група таксама імкнулася сарваць правядзеньне крэдытнай рэформы.

Паказаньні сьведкі Гвазьдзёва

Суд выклікае ў якасьці сьведкі Гвазьдзёва, меншавіка з 1907 году, былога старшыню рабочай групы ў ваенна-прамысловым камітэце ў былога міністра працы ўраду Керанскага. Пры савецкай уладзе ён праваў у розных аб'яднаньнях ВСНГ СССР—ГОМЗЕ, Галоўэлектра, а потым у Дзяржбанку. Ён быў членам меншавіцкай групы ВСНГ СССР. Конкрэтная шкодніцкая работа яго зводзілася да складаньня паменшанага пляну фінансаваньня электропрамысловасьці.

Сумуючы свае паказаньні, Гвазьдзёў заяўляе, што лінія меншавіцкай организацыі была накіравана на дэзорганізацыю народнай гаспадаркі і ўтварэньне дыспропорцыі паміж паасобнымі галінамі прамысловасьці. З гэтай мэтай, адны пляны складаліся з яўным пераялічэньнем, а другія, наадварот, са значным памяншэньнем.

Допыт падсудных Шэра і Бэрлацкага

Дзяржаўнае абвінавачваньне з допыту Шэра і Бэрлацкага ўстанаўлівае тры галоўныя моманты шкодніцкай работы ў Дзяржбанку, якая пачалася ў першых месяцах 28 году. Шкодніцтва ў фінансаваньні сыстэмы спажывецкай коопэрацыі, шкодніцкая рэформа крэдытаваньня прамысловай коопэрацыі, нарэшце спробы да зрыву правядзеньня крэдытнай рэформы.

Допыт падсуднага Громана

Падсудны Громан адзначае, што яго шкодніцкая дзейнасьць у Дзяржпляне зводзілася, галоўным чынам, да складаньня заведама няправільных конъюнктурна-экономічных аналізаў стану народнай гаспадаркі.

Аўладаць марксысцка-ленінскай зброяй

(З прамовы сэкратара ЦК КП(б)Б тав. К. В. ГЕЯ на Усебеларускай нарадзе заг. культпропаў РК КП(б)Б)

Бальшавіцкая тэорыя магутнейшы сродак у барацьбе за генэральную лінію партыі

Калі-б паставіць пытаньне аб агульных задачах нашай тэорэтычнай работы, дык гэта азначала-б неабходнасьць сказаць прамову на тэму аб задачах усёй партыйнай організацыі, бо... «ролю перадавога байца можа выканаць толькі партыя, якая кіруецца перадавой тэорыяй...» (Ленін). Таму, дазвольце спыніцца толькі на некаторых спэцыфічных задачах тэорэтычнай і культурна-пропагандысцкай работы.

У якіх рамках будзе працякаць уся тэорэтычная, выхаваўчая работа нашай партыі? Мы з посьпехам ажыцьцяўляем генэральную лінію партыі, настойліва праводзім яе ў жыцьцё ў абстаноўцы напружанай і рашучай барацьбы супроць клясавага ворага, супроць яго супраціўленьня нашаму разгорнутаму соцыялістычнаму наступленьню. Адлюстраваньнем гэтага клясавага змаганьня зьяўляецца наяўнасьць у радох нашай партыі ўхілаў у бок правага адкрытага опортунізму—галоўнай небясьпекі на даным этапе і ў бок опортунізму, некалькі прыкрытага «левымі» рэволюцыйнымі фразамі. У гэтым змаганьні на два франты супроць скажэньняў генэральнай лініі партыі магутнейшай зброяй зьяўляецца сыстэматычнае тэорэтычнае выхаваньне нашага партыйнага актыву, падрыхтоўка актыву да пасьлядоўнага змаганьня з усялякімі ўхіламі і хістаньнямі ад генэральнае лініі партыі.

Вазьмеце практыку работы нашых раённых організацый, праверце любы раён. Аб чым гаворыць вопыт работы раённых організацый КП(б)Б, які маецца ў нас у ЦК КП(б)Б? да пэўнай колькасьці пытаньняў кіраўнікі паасобных раённых партыйных організацый, наш актыў, які стаіць на чале партыйнай організацыі, на чале ячэйкі, не змаглі падыйсьці правільна, пры чым не змаглі правільна падыйсьці не таму, што яны мелі якую-небудзь другую політычную ацэнку, а таму, што ў іх не хапае даволі шырокага політычнага кругагляду. Мы на-днях, на пасяджэньні бюро Цэнтральнага Камітэту слухалі даклад Касьцюковіцкага РК КП(б)Б. У гэтым раёне нездаровыя зьявішчы ў партыйнай організацыі ішлі па лініі вельмі прымітыўнай, па лініі засьмечаньня партыйнай організацыі чужым элемэнтам, аж да бандытаў, белага афіцэрства і г. д. Характэрна адзначыць, што гэта засьмечанасьць Касьцюковіцкай раённай парторганізацыі мела месца на працягу раду гадоў, была, так сказаць, хронічнай. У гэтай раённай організацыі працавалі, зразумела, і сумленныя і адданыя члены партыі, але іх невыстарчальная клясавая чуласьць, іх невыстарчальны політычны ўзровень не дазволілі ім своечасова сыгналізаваць і своечасова рэагаваць на факты частковага перараджэньня паасобных зьвеньняў Касьцюковіцкай раённай партыйнай організацыі, і іншы раз там, дзе наш нізавы актыў хоча ўзяць у бальшавіцкую пераробку тое ці іншае скажэньне лініі партыі, дык ён, актыў, часта падыходзіць да політычнай ацэнкі гэтага скажэньня вельмі элемэнтарна, вельмі ўпрошчана, замест таго, каб той ці іншы конкрэтны характэрны факт узьняць на належную політычную вышыню.

Уся сыстэма нашага партыйнага тэорэтычнага выхаваньня павінна мець самую цесную органічную ўвязку тэорыі з практыкай, павінна весьці да таго, каб у нас слова не разыходзілася са справай, каб у нас змаганьне супроць правай небясьпекі, супроць «левых» загібаў, супроць прымірэнцтва да ўхілаў, супроць усялякіх скажэньняў ленінскай нацыянальнай політыкі праводзілася на належнай політычнай вышыні, каб партыйны актыў; уся партыйная організацыя ў цэлым, заўсёды карысталіся ў гэтым змаганьні выпрабаванай і выверанай у клясавых баёх зброяй бальшавіцкай марксысцкай тэорыі. Трэба добра памятаць словы правадыра і тэорэтыка нашай партыі, тав. Сталіна, што «тэорыя робіцца беспрадметнай, калі яна ня ўвязваецца з рэволюцыйнай практыкай, таксама і практыка робіцца сьляпою, калі яна не асьвятляе сабе дарогу рэволюцыйнай тэорыяй».

Не паўтарыць леташніх памылак

Цяпер адносна спэцыфічных задач.

Што-ж мы ўскладаем на культпроп, чаго-ж мы чакаем ад работнікаў Культпропу? Зразумела, перш за ўсё сыстэматычнае, наладжанае партыйнае вучобы, якая ахапляе ўсю партыйную організацыю.

Партыйная вучоба ў мінулым годзе была ў нас поўнасьцю сарвана. Калі летась мы моцна лаяліся за зрыў партвучобы некаторыя райкомы, дык паасобныя таварышы нічога не знаходзілі лепшага, як бездапаможна разводзіць ва ўсе бакі рукамі і па сутнасьці справы па опортуністычнаму адказваць: «Выбачайце, у нас колектывізацыя, нам, бачыце, за ўсім ня ўгнацца». Трэба ў парадку самай жорсткай самакрытыкі адзначыць, што летась і ЦК быў вінаваты ў тым, што мы не дабіліся рэзкага, крутога пералому ў бок замацаваньня сыстэматычнай партвучобы. Сёлета мы гэтай памылкі не паўтарым. Аднак, мы маем і ў гэтым годзе рад даных, якія сыгналізуюць аб тым, што партыйная вучоба зноў зрываецца. За зрыў партыйнай вучобы, за опортуністычную недаацэнку яе мы ўдарым як належыць і каго належыць. І калі тав. Чарнушэвіч у сваім даволі вычэрпным і цікавым дакладзе асобы націск зрабіў на неабходнасьць дабіцца, ва што-б там ні стала, каб з такой-жа бальшавіцкай настойлівасьцю і напорыстасьцю, з якімі змагаемся за выкананьне прамфінпляну, за кожны колектывізаваны гектар зямлі—мы змагаліся-б і за партыйную вучобу,—дык ён, бясспрэчна тысячу раз меў рацыю.

Імена так трэба ставіць пытаньне: нацэнуўшы, як трэба, без агаворак, без спасыланьняў на «вузкія» месцы і «об'ектыўныя цяжкасьці» неабходна дабіцца, каб справа парт вучобы ня была бясспрытульнай, ня была пасынкам, не на правох «прымусовага асортымэнту», а састаўной, адказьнейшай часткай работы ўсёй партыйнай організацыі ў цэлым, кожнай партыйнай ячэйкі паасобку.

Зрыў на працягу двух год узапар усёй партыйна-выхаваўчай работы азначаў-бы сабой вельмі значнае адставаньне, а адстаючых, як вядома, б'юць і б'юць вельмі моцна!

Мы не жадаем, каб нас білі.

Наадварот! Мы б'ём і будзем біць усіх нашых клясавых ворагаў. Таму нам усім, сумеснымі намаганьнямі, намаганьнямі ўсёй партыйнай організацыі неабходна пытаньні партыйна-выхаваўчай вучобы паставіць на належную вышыню..

Тры задачы культпропаў

Партыйна - выхаваўчую работу трэба так паставіць, каб яна цясьнейшым чынам была зьвязана з усёй практыкай нашай работы па соцыялістычнаму будаўніцтву. Нельга партыйна-выхаваўчую работу па ўзьняцьці тэорэтычнага ўзроўню ажыцьцяўляць адным толькі адцягненымі разважаньнямі. Партыйнае марксысцка-ленінскае выхаваньне павінна быць непарыўна зьвязана з практыкай работы. Зараз нам неабходна ў гэту ўвязку тэорыі з практыкай увесьці новы момант—момант аўладаньня тэхнікай, аб чым гаварыў тав. Сталін у сваёй гістарычнай прамове на Усесаюзнай нарадзе дырэктароў прадпрыемстваў. Нам трэба партыйна-выхаваўчую сетку і тэорэтычную асьвету зьвязаць, пераплесьці з пытаньнямі тэхнічнага парадку, якія-б дазволілі нашым партыйцам, разам з падняцьцем свайго тэорэтычнага ўзроўню, разам з замацаваньнем сваёй марксысцкай асьветы таксама атрымаць пэўны мінімум тэхнічных ведаў. Я лічу вельмі ўдачнай думку нашага культпропу ЦК КП(б)Б аб тым, каб некалькі спэцыялізаваць партыйнае выхаваньне прыстасоўна да экономічных асаблівасьцяў раёнаў БССР (льнаводчыя, жывёлагадоўчыя і г. д.) з тым, каб і ў сетцы партвучобы даваць членам партыі свае - такія веды з галіны льнаводзтва, жывёлагадоўлі, сьвінагадоўлі, завастраючы гэтым самым ў партыйным асяродзішчы зацікаўленасьць да асяродзішчы зацікаўленасьць да гэтых пытаньняў.

Значыцца, першае, за што ў нас культпропы павінны акказаць,—гэта пытаньні сыстэматычнай партыйнай вучобы.

Другое, што мне здаецца трэба ўскласьці на культпропы, гэта—інтэрнацыянальнае выхаваньне нашай партыйнай організацыі.

Я бяру гэтыя словы «інтэрнацыянальнае выхаваньне» ў шырокім сэнсе гэтага слова.

Мы знаходзімся на мяжы з капіталістычным сьветам. Таму ў нашай партыйнай організацыі яшчэ больш, чым у якой-небудзь іншай павінна быць самае выразнае, яснае ўяўленьне аб тым, што робіцца за межамі Савецкага Саюзу, як жывуць і працуюць комуністычныя партыі ў капіталістычных краінах, аб тым, якія задачы стаяць перад рабочай клясай капіталістычных краін.

Фактаў політычнай няпісьменнасьці, верхаглядзтва і няправільнага блытанага ўяўленьня ў галіне пытаньняў інтэрнацыянальнай работы партыі ў нас яшчэ ня мала.

Нядаўна меў месца выпадак, калі цэнтральная комсамольская газэта «Чырвоная Зьмена» з выпадковага повада выступіла з заметкай, якая давала адкрытую права-опортуністычную ўстаноўку ў пытаньнях міжнароднага рабочага руху.

Я схільны верыць, што ў таварышоў, якія працуюць у рэдакцыі газэты «Чырвоная Зьмена», гэта здарылася не ад права-опортуністычнай устаноўкі наогул, а ад самай элемэнтарнай, абураючай недапушчальнай політычнай няпісьменнасьці. Але... нам ад гэтага не лягчэй, факт застаецца фактам, што ў комсамольскай газэце, у даволі ясным пытаньні дапушчана буйная політычная памылка.

Гэты выпадак паказвае, што сёньня навят з таго актыву, які стаіць на такіх пастах, якія, здавалася-б, патрабуюць элемэнтарных ведаў заграничнага рабочага руху, дапушчаюць вельмі буйныя памылкі ў гэтых пытаньнях.

Нарэшце, трэцяе пытаньне, на якім я лічу неабходным спыніцца,—гэта пытаньне аб правядзеньні нацыянальнай політыкі партыі і ў прыватнасьці пытаньне аб правядзеньні пастановы Кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б. Мы ў пастанове Кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б вельмі ясна і пэўна запісалі, што:

«... Рашуча адкідаючы рэакцыйную тэорыю змаганьня дзьвёх культур, якая льле ваду на млын і вялікадзяржаўнага і беларускага шовінізму, партыя стаіць за брацкае супрацоўніцтва рабочых і працоўных мас усіх нацыянальнасьцяў у справе будаўніцтва міжнароднай пролетарскай культуры. На даным этапе ўдзел беларускага пролетарыяту ў справе будаўніцтва міжнароднай пролетарскай культуры заключаецца ў тым, каб разгарнуць у межах БССР пасьпяховае будаўніцтва культуры, соцыялістычнай па свайму зьместу, нацыянальнай (беларускай) па сваёй форме. Гэта задача можа быць выканана толькі пры ўмове ажыцьцяўленьня непаслабнага партыйнага кіраўніцтва справай культурнага будаўніцтва. (Падкрэсьлена намі. К. Г.).

Перад партыйнай організацыяй стаіць вялікая задача — організаваць і стаць на чале ўцягненьня шырокіх рабочых мас у справу культурнага будаўніцтва і нацыянальнай політыкі. Рабочыя масы пад кіраўніцтвам партыі павінны ўзяць на сябе ініцыятыву ў вывучэньні беларускай мовы ў ажыцьцяўленьні беларусізацыі дзяржаўнага, гаспадарчага, кооперацыйнага і профсаюзнага апарату, у вывучэньні гісторыі і экономікі Беларусі і г. д.».

У гэтай-жа пастанове пленуму ЦК КП(б)Б мы асобна падкрэсьлілі, што наша адна з важнейшых задач—гэта забясьпечыць далейшы, яшчэ больш рашучы зрух у рабочай масе і ў радох партыі ў адносінах справы беларусізацыі.

Мы сказалі што:

«... Неабходны рашучы зрух у справе беларусізацыі партыйнай работы, асабліва ў вышэйшых і сярэдніх яе зьвеньнях.

Пленум ухваляе ініцыятыву Фрунзэўскага і Кастрычніцкага райкомаў, якія правялі месячнік праверкі беларусізацыі, і прапануе ўсім партыйным організацыям павесьці адпаведную работу па праверцы становішча беларусізацыі і работы сярод нацменшасьцяй, аб'яднаўшы яе з масавай растлумачальнай работай аб задачах і мэтах нацыянальнай політыкі ў БССР. Трэба ўзмацніць змаганьне за поўную беларусізацыю як дзяржаўнага, так і гаспадарчага апарату».

Задача партыйнай організацыі ў тым, каб зрабіць далейшы зрух у радох рабочае клясы БССР, забясьпечыць ўцягненьне мас рабочых у справу нацыянальна-культурнага будаўніцтва,бо без аўладаньня беларускаю моваю, без беларусізацыі—удзел у нацыянальна-культурным будаўніцтве немагчымы.

Прымаць удзел у нацыянальна-культурным будаўніцтве могуць і павінны ня толькі беларусы па нараджэньню і паходжаньню, але могуць і павінны ўсе працоўныя масы. Мы—інтэрнацыяналістыя. Але для таго, каб прымаць удзел у нацыянальна-культурным будаўніцтве, трэба ведаць мову.

Форсіраваць тэмпы беларусізацыі рабочай клясы

Рабочая кляса БССР у сілу гістарычных умоў складаецца з 40 проц. беларусаў па нараджэньню, прычым пэўная частка гэтых 40 проц. ня вельмі добра ведае беларускую мову, а 60 проц. агульнага ліку рабочай клясы складаецца з рабочых іншых нацыянальнасьцяў. Таму зусім зразумела, што сапраўднае пролетарскае кіраўніцтва справай нацыянальна-культурнага будаўніцтва мы зможам забясьпечыць толькі тады, калі зробім далейшы рашучы зрух у рабоце па беларусізацыі рабочай клясы, будуючы гэту работу на добраахвотных пачатках, зацікаўліваючы партыйную і беспартыйную рабочую масу аўладаньнем беларускай мовай, зацікаўліваючы іх у пастановцы праблем навуковай работы.

І я думаю, што ініцыятыва пастаноўкі нацыянальнага пытаньня, ініцыятыва работы па нацыянальнаму культурнаму будаўніцтву, ініцыятыва ўцягненьня партыйных мас у справу беларусізацыі на прадпрыемстве, там, дзе ў нас беларуская мова ўсё яшчэ ня так шырока прышчапляецца,—павінна быць таксама ўскладзена і на культпропы.

Тут, таксама як і ў іншых пытаньнях ,аддзелы культуры і пропаганды павінны праявіць ініцыятыву, узяць гэту ініцыятыву ў свае рукі, павінны патрабаваць ад парторганізацый, каб пастановы Кастрычніцкага пленуму не засталіся на паперы, а рашуча і пасьлядоўна праводзіліся ў жыцьцё.

(Бурныя воплескі)

Аб судовым процэсе над 167 сялянамі

Пастанова сэкратарыяту ЦК КП(б)Б

Заслухаўшы даклад камісіі аб расьледваньні справы па організацыі ў Капылі судовага процэсу над 167 сялянамі, ЦК КП(б)Б адзначае:

а) Організацыя судовага процэсу над 167 сялянамі зьявілася фактычнай вылазкай клясавага ворага, які скарыстаў судовы апарат у сваіх клясава-варожых мэтах для падрыву гаспадарча-політычных кампаній на вёсцы і саюзу рабочай клясы з асноўнымі масамі сялянства.

Непасрэдны організатар процэсу—народны судзьдзя Лашчэўскі зьявіўся фактычным правадніком кулацкай політыкі пад прыкрыцьцём формальна бюрократычных заяў.

б) Працаўнікі канторы Дзяржгандльбелу Энцін, Бохан і Кароткі, зьяўляючыся адкрыта агентурай кулацтва ў савецкім апараце, узьнялі справу на аснове хлусьлівых і блытаных матар'ялаў для таго каб стварыць адмоўныя настроі з боку бядняцка-серадняцкага сялянства да правядзеньня чарговых гаспадарча-політычных кампаній.

в) Вучастковы прокурор зусім правільна ператварыў судовы процэс у процэс супроць яго організатараў і канчаткова выкрыў усю блытаніну і беспадстаўнасьць, пад прыкрыцьцём якіх організаваўся процэс. Акрамя таго, пастаноўка пытаньня аб процэсе прокурорам перад кіруючымі раённымі організацыямі і брыгадай рэдакцыі „Зьвязды“ сьведчыць аб правядзеньні прокурорам правільнай політычнай лініі.

г) Бюро Капыльскага райкому КП(б)Б, прэзыдыум РКК і фракцыя РВК правілі опортуністычную недаацэнку гэтай судовай справы, як вылазкі клясавага ворага. Ня гледзячы на тое, што большасьць членаў бюро райкому (Мурашкевіч, Шлэйфэр, Квасьніцкі) ведалі аб організацыі процэсу, імі ня было прынята ніякіх мер да своечасовага спыненьня процэсу, які быў яўнай вылазкай клясавага ворага, і прыцягненьня да адказнасьці яго організатараў.

Бюро райкому і прэзыдыум РКК зразумелі выключна формальна і опортуністычна зусім правільную дырэктыву ЦКК УсеКП(б) аб неўмяшаньні ў конкрэтныя судовыя справы і недаацэньваюць кіраўніцтва парторганізацыі савецкімі організацыямі ў галіне судова-сьледчай работы.

д) Адсутнасьць шырока разгорнутай самакрытыкі ў організацыі спрыяла стварэньню судовага процэсу. Раённая газэта „Колгасьнік Капыльшчыны“ не праводзіць рашучай барацьбы за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі і не зьяўляецца організатарам мас на пасьпяховае выкананьне гаспадарча-політычных кампаній.

ЦК КП(б)Б адзначае, што рэдакцыя „Зьвязды“ і яе брыгада, якая працавала ў Капыльскім раёне, далі правільную ацэнку процэсу.

ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1) Райкому КП(б)Б зараз-жа разгарнуць шырокую растлумачальную работу аб політычнай сутнасьці гэтай шкодніцкай справы сярод рабочых, батракоў, колгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас сялянства, яшчэ больш мобілізуючы ўсю парторганізацыю на барацьбу за генэральную лінію партыі, вядучы рашучую барацьбу з правым опортунізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, з „левымі“ загібамі і прымірэнцтвам да ўхілаў ад лініі партыі.

Райком КП(б)Б павінен мобілізаваць парторганізацыю на рашучую барацьбу з рэцыдывамі правага опортунізму, якія маюць месца, як вынік мінулага права-опортуністычнага кіраўніцтва ў парторганізацыі.

2) Узмацніць кіраўніцтва раённай газэтай і рашуча разгарнуць бальшавіцкую самакрытыку, мобілізуючы парторганізацыю і ўсю савецкую грамадзкасьць на ўзмацненьне работы па колектывізацыі сельскай гаспадаркі, на замацаваньне існуючых колгасаў, разгарнуўшы сапраўды бальшавіцкую работу па організацыі новых і прыліву батракоў і бядняцка-серадняцкіх мас у існуючыя колгасы, на рашучае наступленьне на кулацтва і на пасьпяховую падрыхтоўку і правядзеньне веснавой сяўбы.

3) Райкому КП(б)Б узмацніць кіраўніцтва работай савецкага і судова-сьледчага апарату, ачысьціўшы яго ад варожых і клясава-чужых элемэнтаў, забясьпечыўшы правядзеньне сапраўды клясавай лініі ў рабоце саветаў, судова-сьледчых органаў і ўсіх організацый і ўстаноў раёну.

4) Прапанаваць прокурору рэспублікі тэрмінова скончыць сьледзтва па гэтай справе, прыцягнуўшы да суровай адказнасьці асоб, вінаватых у організацыі судовага процэсу.

5) Скасаваць пастанову РК КП(б)Б аб вынясеньні вымовы вучастковаму прокурору.

6) За праяўленыя опортуністычныя адносіны з боку райкому да організацыі судовага процэсу і нерэагаваньне абвясьціць бюро райкому вымову. Прасіць ЦКК прыняць адпаведныя меры ў адносінах прэзыдыума РКК.

МЕНШАВІКІ-ІНТЭРВЭНТЫ ІМКНУЛІСЯ САРВАЦЬ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ БУДАЎНІЦТВА

У адказ на гэта

АБВЕСЬЦІМ штурм ліквідацыі прарываў і паход за аўладаньне тэхнікай

УЗЬНІМЕМ на вышэйшую ступень хвалю соцспаборніцтва, працу плянава-опэрацыйных груп і конвэеру якасьці

АБВЯСЬЦІЦЬ ШТУРМ ПРАРЫВАЎ

весткі з фронту выкананьня аў 3-га рашаючага году пяці-, вынікі першых двух месяцаў чаць аб зусім слаба разгорну- працы па барацьбе за выкане кантрольных лічбаў 3-га пяцігодкі.

ці год паставіў асабліва адказ- задачы перад пролетарыятам. ачаныя 45 проц. узьняцьця орчасьці павінны быць выка-.

оцэс „прампартыі" і прахо- зараз процэс інтэрвэнтаў авікоў выклікалі вялікую хва- бурэньня з боку працоўных жаданьне яшчэ больш змагац- фронце соцыялістычнага бу- цтва.

здольнасьць організаваць і піць гэты энтузіязм, нежаданьне магацца і перамагаць цяжкась- кія стаяць на шляху, зьяўля- ярбім праяўленьнем правага унізму на практыцы, які грае ку клясаваму ворагу.

мешчаная сёньня пастанова бю- енгаркому ЛКСМБ адзначае не- пчальныя адносіны да мобілі- ўвагі рабочай моладзі на ба- у за прамфінплян.

бач з гэтым, мы зьмяшчаем аму конкрэтных дзеяньняў, якую выпрацаваў комсамол заводу „Комунар". У сваёй програме комсамольцы прапануюць стварыць вячэрні ВТНУ, які павінен даць вышэйшыя тэхнічныя веды рабочым ударнікам.

Падтрымоўваючы гэтую ініцыятыву, мы лічым, што гэтым пытаньнем павінны зараз-жа заняцца органы народнай асьветы з тым, каб рабочы ўдарнік мог аўладаць тэхнічнымі ведамі.

Адначасова з гэтым мы азначаем некаторае паслабленьне на паасобных вучастках у разгортваньні працы па соцыялістычнаму спаборніцтву. Плянава-опэрацыйныя групы і скразны конвэер якасьці да гэтага часу ня сталі асноўнаю зброяй у барацьбе за выкананьне колькасных і якасных паказчыкаў промфінпляну.

Баявыя вытворчыя зьлёты-трывогі, якія зараз праводзяцца, павінны паслужыць праверкай нашай барацьбы ў гэтай галіне.

Шырока разгортваючы працу плянава-опэрацыйных груп, скразнога конвэеру якасьці, барацьбу за аўладаньне тэхнікай, неабходна дамагчыся поўнай ліквідацыі прарываў на ўсіх вучастках нашай соцыялістычнай будоўлі.

Выходзім у бой за тэхніку

АРГАНІЗАВАЦЬ ВЯЧЭРНІ ВНТУ

прапануюць комсамольцы ўдарнага „Комунара"

Аб'яднанае паседжаньне бюро колектыву ЛКСМБ, рэдколегіі шматтыражкі і ІТР, абгаварыўшы пытаньне аб паходзе за аўладаньне тэхнікай і рэалізацыі пастановы ЦК УсеЛКСМ аб паходзе за тэхніку, уключаецца ў паход і запэўнівае партыю і комсамол, што завод які зьяўляецца ўдарным у барацьбе за выкананьне прамфінпляну, з той-жа бальшавіцкай рашучасьцю будзе змагацца і за аўладаньне тэхнікай.

Нарада лічыць неабходным організаваць для рабочых гораду Менску вячэрні ВТНУ з мэханічным аддзяленьнем для ўдарнікаў заводаў „Комунар", „Энэргія", „Полымя Рэволюцыі" і „Ударнік".

Комсамольскі колектыў заводу „Комунар" разам з усёй заводзкай грамадзкасьцю ўключыўся ва ўсесаюзны паход комсамолу за тэхнікай.

Завод гіганцкі вырас. З 1300 рабочых і 5-мільённай вытворчай програмай уважоў завод у 3-ці, рашаючы год пяцігодкі. Гэты гіганцкі рост прад'яўляе свае патрабаваньні. Яму патрэбны кваліфікаваныя токары, стругальшчыкі, фрэзаўшчыкі, фармоўшчыкі, кавалі, сьлесары і інжынэра-тэхнічныя работнікі. Але іх не хапае.

Учарайшы чорнарабочы сёньня працуе токарам ля варштату. Але ён ня ведае ўзаемадносін частак варштата, ня ведае чаму часам ня ладзіцца яго праца, як ня ведае тэхнолёгічнага процэсу свайго вырабу.

Ня тольки токар, учарайшы чорнарабочы, ня ведае свайго варштата, фармоўшчык, які зафармаваў добра „апоку", ня ведае з якой прычыны ў яго атрымаўся брак. Нічога няма дзіўнага. Завод патрабус кваліфікаваных, тэхнічна падкаваных рабочых. Адсюль своечасова пастаўлена пытаньне аб наступе на фронце аўладаньня тэхнікай. І завод уключыўся ў гэты наступ.

Пашыраная нарада, прысьвечаная паходу за аўладаньне тэхнікай і рабоце плянава-опэрацыйных груп, была сапраўды масавым мерапрыемствам.

Нарада пастанавіла:

Організаваць у мэханічным цэху гурток па вывучэньню такарных, фрэзавальных і сьвідравальных варштатаў, пачаўшы гэтую працу не пазьней 10 сакавіка гэтага году.

Організаваць агульна-гарадзкі куток па вывучэньню чарчэньня, які павінен прыступіць да вучобы не пазьней 15 сакавіка гэтага году.

Організаваць пры заводзкім клюбе гурток тэхнікі, які навінен наладзіць тэхконсультацыю. Гурток павінен пачаць працу не пазьней 15 сакавіка.

Організаваць вечар тэхнікі, які павінен расглумачыць задачы паходу за тэхніку.

На працягу 4-х месяцаў прачытаць у мэханічным ліцейна-модэльным і кавальным цэхах па 12 тэхнічных лекцый на тэмы аб элемэнтах у прыродзе і іх хэмічных узаемаадносінах, аб асноўных і дапаможных матэр'ялах па ліцейнай справе, аб разуменьні супраціўленьня матар'ялаў і г. д.

У бляшаным цэху прачытаць 7 лекцый, каб даць асноўныя разуменьні аб элемэнтах у прыродзе і іх хэмічных узаемаадносінах, асаб. лівасьці атрыманьня мэталяў для бляшаных вырабаў, процэсе полуды і ацынкоўкі, пайкі і электрозваркі, аб стратах на вытворчасьці і г. д.

Для азнаямленьня рабочых і інжынэрна-тэхнічных работнікаў з найноўшай тэхнікай лічыць мэтазгодным прачытаць 6 агульна-заводзкіх лекцый. Для інжынэрна-тэхнічных работнікаў заводу організаваць асобны гурток, які павінен быць разьлічаны на больш доўгі час.

У сувязі з шэфствам ленінскага комсамолу над электрафікацыяй, лічыць неабходным організаваць на заводзе ячэйку па вывучэньню электрычнасьці і барацьбу за экономію яе.

З мэтай перабудаваць работу плянава-опэрацыйных груп заводу на вышэйшыя формы, як барацьба за зьніжэньне сабекошту, за якасьць, рацыяналізацыю, плянаваньне і г. д. правесьці праверку працы і кіраўніцтва групай з тым, каб яна магла сапраўды стаць баявым Дзяржплянам для варштата.

Комсамольскі колектыў заводу „Комунар", выступіўшы ва ўсесаюзны паход за тэхніку, абвяшчае бязьлітасную барацьбу браку, безгаспадарнасьці, разгільдзяйству, выступае за соцыялістычную рацыяналізацыю вытворчасьці і прад'яўляе свой рахунак астатнім комсамольскім колектывам мэталюргічных прадпрыемстваў.



Сакратар колектыву ЛКСМБ т. КАНОПІК і прэміраваны ўдарнік—якасьнік т. МАРШАК. Па сярэдзіне—ударнік ля варштата.

Змагацца за 45 проц., ня менш!

Зрабіць адпаведныя вывады

Да дапушчаныя прарывы і няздольнасьць іх ліквідаваць, распушчана бюро колектыву ф-кі „АКЦЯБР" і „8 Сакавіка", абвешчана вымова--бюро яч. „Комунарка", „Чырвоная Зорка" і фабрыкі імя „Крупскай"

(З пастановы бюро Менскага Гаркому ЛКСМБ ад 5-III—31 г.

Бюро Гаркому констатуе, што па ных 11-ці прадпрыемствах гор. у прамфінплян за студзень і ён лютага выканан у сярэднім 92 проц. Лічачы такое становіабсолютна нецярпімым, Бюро му ЛКСМБ пастанаўляе:

1.) Бюро колектыву ЛКСМБ ф-кі бр", якое ня здолела стаць на зьнятай актыўнасьці мас комцаў і рабочай моладзі не орыла комсамольскія масы на заньне павароту, які ёсьць з пераньнем яго на вышэйшую ступень абясьпечыла пасьпяховае выра- е павышанных запатрабаваньк кія рад'яўляюць нам ударныя 3-га, рашаючага году 5-годкі ка, плян, рацыяналізацыя)—расць. Складу Бюро колектыву абць вымову. Сэкратара к-ву, тав. іцкага, адклікаць па загаду Гар- КСМ.

б) а поўную бязьдзейнасьць, праравага опортунізму на практы- аўленьне рэальнасьці прамфін- выкананьне яго на 53 проц., шчваньне соцспаборніцтва і цтва і г. д.) Бюро КСМ яч. -га сакавіка распусьціць. Сэк- КСМ яч., тав. Зобінай, абвясь- мову.

юро КСМ яч.: Комунаркі, Чырвонай Зоркі, Крупскай, за бязьдзейнасьць абвясьціць вымову.

г) Прыняць даведама заявы сэкратароў КСМ яч. Шклозаводу, „Пролетары" і Сьпіртзаводу аб здавальняючым удзеле КСМ яч. у выкананьні прамфінпляну. Даручыць орг. інстр. аддзелу ў 5-дзённы тэрмін наладзіць дэталёвы агляд адзначаных яч. па пытаньню аб вытворчай працы, пасьля чаго на чарговым паседжаньні Бюро Г. К. 10-III—31 г. мець аб іх асобныя меркаваньні.

2. Сакавік м-ц абвясьціць месяцам ліквідацыі студзеньскага і лютаўскага прарыву. Да 12-3 правесьці штурмавыя конфэрэнцыі комсамольцаў і рабочай модадзі, на якіх паставіць даклады гаспадарнікаў аб прарывах у выкананьні промфінплянаў, забясьпечыўшы неадкладны становчы пералом па ўсіх грунтоўных паказчыках.

3. Перагледзець і давясьці да варштата, кожнага рабочага заданьні прамфінпляну; улічваючы наяўнасьць прарыву даць да 10-3 новае штодзеннае заданьне выпрацоўкі, якое-б забясьпечыла поўнае выкананьне квартальнага заданьня.

4. Абавязаць усе колектывы і яч. ў 3-х дзённы тэрмін прапрацаваць конкрэтныя пляны паходу за аўладаньне тэхнікай для кожнай фабрыкі, цэху, брыгады, кожнага рабочага, выпрацаваўшы іх папярэдня з ІТР прадпрыемстваў.

Організаваць масава-вытворчую пропаганду, разгарнуць шырокую сетку тэхнічных гурткоў, дабіваючыся поўнага аўладаньня вытворчымі процэсамі, максымальнай мэханізацыі работ, асваеньня з мэханізмам новай тэхнікі. Ухваліць распрацаваныя КСМ колектывам зав. Комунар мерапрыемствы, рэалізацыю іх, забясьпечыўшы выкананьне пастаноў Г. К., якія ёсьць па гэтаму пытаньню.

У канцы сакавіка правесьці выбарачны агляд організацыі па пытаньню аб выкананьні пастаноў Гаркому КСМ аб паходзе за аўладаньня тэхнікай, плянамі рацыяналізацыі.

5. Выкарыстаць мэтады ўдарнай працы асобнага кварталу: організацыя батальёнаў ударнікаў-энтузіястых, штурмавыя брыгады, заслоны папярэджаньня прарыву. Утварыць па прадпрыемствах пераклічкі ўдарнікаў з мэтай выяўленьня і рашучай барацьбы з ілжэўдарніцтвам, скарыстоўваючы мэтады работы, якія ёсьць у гэтай галіне (лёзунгі, плякаты, касы і выстаўкі, прагульшчыкаў, паказы конкрэтнай страты

Да гэтай справы прыцягнуць шырокія масы піонэрскай і школьнай організацыі.

6. Організаваць па ўсіх цэхах агрэгатах і брыгадах трывожныя комсамольскія ільлічоўкі, накіроўваючы бязьлітасцы агонь на ўсіх тых, якія вінаваты ў прарывах прамфінпляну, б'ючы па іх як па яўных права-опортуністых, якія затрымліваюць тэмпы нашага соц.-будаўніцтва.

7. Надаючы выключна-важнае значэньне масавай рабоце КСМ на вытворчасьці, прапанаваць масава-экономічнаму аддзелу ГК і ўсім КСМ колектывам і яч. забясьпечыць пасьпяховае правядзеньне зьлёту рабочай моладзі па галінах прамысловасьці і транспарту.

У пачатку красавіка правесьці агульна гарадзкі-зьлёт маладых ударнікаў-энтузіястых.

Прапанаваць колектывам і яч. неадкладна распрацаваць гэтую пастанову на масавых адкрытых сходах колектываў яч. КСМ.

11-3-31 г. склікаць па гэтаму пытаньню гар. нараду сэкратароў яч. і колектываў.



Далей разважаньняў не пайшлі

Організацыя плянава-опэрацыйных груп у Барысаве ідзе зусім марудна. Буйныя вытворчыя колектывы, як „Бярэзіна", комбінат і інш. пакуль што займаюцца толькі разважаньнем аб організацыі плянава-опэрацыйных груп, ня больш.

На комбінаце „Пролетарскі Молат" організаваны дзьве комсамольска-вытворчыя комуны, але без належнага кіраўніцтва і дапамогі комуны разваліліся.

Неабходна палепшыць становішча вытворчых комун з тым, каб гэтая вышэйшая форма соцыялістычнага спаборніцтва, таксама як і плянава-опэрацыйная група, стала сапраўдным конкрэтным мэтодам барацьбы за выкананьне пяцігодкі ў 4 гады, за ліквідацыю прарываў.

Агульным наступам колёў, комун і плянавікоў неабходна дамагчыся ліквідацыі прарываў.

Баравы.

МЦІСЬЛАУСКІ І ДРЫБІНСКІ РК ЛКСМБ

ЗАНОСІМ НА ЧОРНУЮ ДОШКУ

На працягу ўдарнага месячніка скончыць ільназагатоўкі

Х-ты ўсебеларускі зьезд саветаў у сваёй адозьве да працоўных БССР паставіў перад комсамолам задачу паказаць сапраўдныя бальшавіцкія ўзоры барацьбы за выкананьне плянаў усіх відаў загатовак. Аднак, зьмешчаныя сёньня матар'ялы з Дрыбінскага і Мсьціслаўскага раёнаў паказваюць, што кіраўніцтва комсамольскіх камітэтаў гэтых раёнаў надааценіла важнасьць ільназагатовак для нашай прамысловасьці, пакладаючы надзеі на самацёк не мобілізавала комсамольцаў і колгасную бядняцка-серадняцкую моладзь на выкананьне зусім рэальных плянаў і гэтым самым не апраўдала закліку зьезду.

Паасобныя комсамольцы Пахуцянскай ячэйкі, Дрыбінскага раёну, замест быць у першых шэрагах здатчыкаў, самі ні кілё ня здалі і, больш таго, выступалі супроць ільназагатовак. Гэтая кулацкая агентура ў шэрагах комсамолу не атрымала ніякага адпору.

Трэба нарэшце пакласьці канец таптаньню на месцы. Пляны загатовак зусім рэальныя, і мы павінны ва што-б там ні было выканаць іх. Трэба прыняць рэпрысыўныя захады да кулацка-заможных гаспадарак, якія саботуюць загатоўкі.

Трэба яшчэ шырэй разгарнуць работу па мобілізацыі колгасна-бядняцка-серадняцкіх мас на выкананьне ільна-загатовак.

Кулакі пакінуты ў спакоі

ДРЫБІН, 6.—(Ад нашага юнкора)—Раённыя ўстановы Дрыбіншчыны, ня гледзячы на неаднаразовыя сыгналы друку, працягваюць сваю опортуністычную бязьдзейнасьць у ільна-загатоўках. Правалі́ўшы двухдэкаднік штурму прарываў у ільназагатоўках, ніводная організацыя ня ўключылася ў месячнік, які быў абвешчан Х усебеларускім зьездам саветаў.

Гадовае заданьне на 1-ае сакавіка выканана толькі на 11,6 проц.

РВК не перагледзеў яшчэ складу кулацкіх гаспадарак, якіх некалі налічыў 0.4 проц. тады як ў р-не іх значна болей.

Кіраўніцтва Карабескага і Пакуцянскага сельсаветаў стараецца пераканаць у тым, што ў іх улакоў няма і няма да каго даводзіць цьвёрдыя заданьні.

За 10 дзён процант спагнанага ільна-ва а на э кулацка-заможных гаспадарак раёну ўзрос толькі на 5 (з 45 проц. да 50 проц.)

Комсамольскія ячэйкі на чале з райкомам комсамолу, працягваюць свао бязьдзейнасьць. Комсамольцы Пакуцянскай ячэйкі самі ня здалі лён, і былі факты, калі некаторыя ў іх выступалі супроць правядзеньня ільназагатовак.

С—вы.

Таптаньне на месцы

Двухдэкаднік штурму прарываў у ільназагатоўках па Мсьціслаўскім раёне прайшоў вельмі марудна і ня даў абсолютна ніякіх зрухаў.

Паасобныя сельсаветы ніякай работы па загатоўках не праводзяць, а чакаюць прыезду брыгад з гораду.

Кіраўніцтва Янаўскага сельсавету зусім здало клясавыя позыцыі, цьвёрдых заданьняў да кулацка-заможных двароў не давяло, а разам з імі п'янствуе.

Бясчынна паступае лён з колгасаў. Маюцца факты, калі паасобныя колгасы (Радзівонаўка, Міцькаўшчына) разьмеркавалі лён паміж колгасьнікамі, а дзяржаве не здалі нават тае колькасьці, якая была закантрактавана.

Райколгассаюз не мобілізаваў масы колгасьнікаў і колгасьніц вакол гэтай важнейшай палітычнай кампаніі. Ен нават ня ведае колькі ў колгасах апрацавана лёну, колькі здана і колькі павінна быць здана.

Райкоопсаюз ня даў ніякіх паказаньняў сваім аддзяленьням і загатоўчым пунктам адносна прэміяваньня здатчыкаў прамтаварамі. Закантрактаваны лён да гэтага часу не паступіў поўнасьцю.

Раённая комсамольская організацыя ніякага ўдзелу ў правядзеньні ільназагатовак ня прымае.

Львовіч.

Да суровай адказнасьці

Выкананьне розных відаў загатовак спажывецкім таварыствам Петрыкаўскага раёну праходзіць нездавальняюча. Так, таварыства павінна загатовіць 95 тон ільна-валакна, а загатовіла толькі 11,6 тоны, бульбы замест 3300 тон, загатовіла 1447.

Пянькі з патрэбных 756 цэнт. не загатовіла ніводнага кілё.

Зьмешчаны ў газэце „Чырвоная Зьмена" матар'ял аб колектыўнай бязьдзейнасьці „загатоўчых організацый Петрыкаўскага раёну, не знайшоў адпаведнага рэагаваньня. Бязьдзейнасьць працягваецца і зараз

Опортуністы Мэйлах з спажывецкага таварыства гаворыць, што ільназагатоўкі нельга далей весьці, бо валакно ўжо папрадзена, ужо нічога не дапаможа".

Спажывецкае таварыства ня прыняла ніякіх захадаў для прэміяваньня здатчыкаў ільна-валакна. Адказныя працаўнікі спажывецкага таварыства ніколі ня бываюць на раёне і ня кіруюць сваімі аддзяленьнямі.

Спадзяемся, што на гэты раз РСІ зоймецца гэтымі фактамі і прыцягне да суровай адказнасьці зрыўшчыкаў загатовак.

Пост „Чырвонай Зьмены"
Пінчук

Рэпрэсыўныя меры да кулакоў ня прыняты

Варотаўскі сельсавет, Сьміловіцкага раёну, ня ўключыўшыся ў праведзеньне месячніку па ліквідацыі прарываў у загатоўках і мобілізацыі сродкаў. Сельсавет ня прыняў ніякіх рэпрэсыўных захадаў да кулацка-заможных гаспадарак, якія атрымалі цьвёрдыя заданьні па загатоўках і іх ня выканалі.

Г.

Выканаць пляны пушмэхзагатов…

Адкрыты ліст да ўсіх загатоўцаў Белкооппаляводсаю… Белкоопсаюзу, Белмалжывёлсаюзу, комсамольцам, наст… нікам, усім колгасам, саўгасам, піонэрам і школьніка…

Дарагія таварышы! Плян адгрузкі пушмэхсыравіны за два месяцы 1-га кварталу выкананы на 55 проц. Гэта ганебнае невыкананьне пляну ставіць пад пагрозу зрыву дырэктывы ўраду аб адгрузцы пушмэхсыравіны на экспорт і прамысловасьць.

Выкананьне плянаў загатовак пушсыравіны, як асноўнага віду экспорту і задаваленьня сыравінай мехавай прамысловасьці, патрабуе, каб комсамольская і профсаюзная організацыі дапамаглі пераключыць на ўдарныя тэмпы ўсю працу загатоўчых організацый.

Загатоўчыя організацыі павінны:

1. Давесьці пляны вясеньніх загатовак да кожнага працаўніка нізавога пункту, колгасу, паляўнічага, комсамольскай ячэйкі і школы.

2. Праводзіць растлумачальную працу вакол правільнай і якаснай апрацоўкі вясеньніх відаў, асабліва крата, засушыўшы яго ў пласьцінавым выглядзе, што павялічыць яго каштоўнасьць на 50 проц.

3. Наладжваць падворную зборку як асноўных, так і другарадных відаў пушной сыравіны;

4 У мэтах грамадзкага кіраўніцтва кампаніяй неабходна пры раёнах, сельсаветах організоўваць штабы садзейнічаньня вясеньнім загатоўкам.

З свайго боку, у справе актыв… загатовак і загатоўкі другарадны… даў пушсыравіны, бярэм на ся… ступныя абавязкі:

1 Організаваць пасылку ўд… брыгад і паасобных ударнікаў… чых у раёны.

2) Своечасова забясьпечыць… краталоўкамі, літаратурай і пля… па вясеньнім загатоўкам;

3) З прэміяльнага фонду пу… дыкату лепшаму раёну, загато… пункту, колгасам, ячэйцы КСМ, п… атрадам і школам будуць выдан… міі за лепшую організацыю рабо…

Мы ўпэўнены што агульныті… мы зможам выканаць пастаўлень… раз намі надзвычайна адказныя… чы па збору вясеньніх віда пу… сыравіны, памятаючы аб тым, ш… сьпяховае выкананьне і перавыка… не нашых плянаў гэта—новыя ма… для індустрыялізацыі краіны і… будовы сельскай гаспадаркі на с… лістычны лад.

Пляны загатовак павінны быць… наны.

Адміністрацыя менфут… пушсындыкату, ячэйка… профупаў ав…

У ХАЦЕ-ЧЫТАЛЬНІ ПУСТА

Пры нардоме мястэчкі Бярэзіна ёсьць хата-чытальня, але яна не працуе. На студзень месяц у чытальні ня было ніякіх газэт, бо адказны працаўнік, бачыце, не выпісаў іх. У нардоме часамі праводзяцца розныя лекцыі, але лектар сыстэматычна позьніцца, а то і зусім на прыходзіць, зрываючы ўсю працу.

Жвавы

„Ціша, ды гладзь"

У Праскоўскім сельсавеце, як у колгасах, так і па-за колгасамі, культпраца зусім не вядзецца. Комсамольская ячэйка не зьвяртае на гэта ніякай увагі. Гучна-гаварыцель у чытальні маўчыць. Культвечары пастаноўкі н'ес, не праводзяцца ўжо 4 месяцы, як аб насьцягнецца гуку.

С. А.

Аб галоўным забы…

У Тальскім Сельсавеце, Любан… раёну, растлумачальная работа… наразовым зборы на гаспадарча… турнае будаўніцтва вёскі не… дзіцца. Сельсавет да аднара… збору падыйшоў формальна: н… абвесткі і ўручыў іх сялянам, н… тлумачыўшы значэньня культу… зборку. У гэтым-жа сельсавеце… пусьціў провакацыйныя чуткі,… кул т збор гэта „другі падатак"… контррэволюцыйнай кулацкай аг… сельсавет ня даў адпору.

Комсамольская ячэйка Тал… сельсавету стаіць у баку.

Бу…

Шахматы і шаш…

Разьвязаньне шахматн… задачы

Каменецкага, прысьвечанай… Зьезду ЛКСМБ.

1. f 5—f 6

Правільнае разьвязаньне да… т. т. Клебанаў (Гомель), С. Б… М. Ждановіч І. Брэгман (Бабр… М. Пруцес (Слуцак), Б. Фідэль… (Нова-Барысаў), Цурын (Нова… Чарнаўскі (ст Ворша), Го… (Чавусы).

Прыняць рашуч… меры

У Віцебску зусім не адчу… шахматна-шашачная праца на… прыемствах. Шахматна-шаш… сэкцыя СФК на кожным пасед… ні ставіць пытаньне аб органі… гурткоў, але нічога практычна… прымаецца. Шахматна-шашачн… тут яшчэ не праніклі ў лісто… Шварніка аб узмацненьні і не… дове шахматна-шашачнай прац… выніку ва ўсім Віцебску зара… працуе ніводзін гурток. Нават Гарпрофсавеце яшчэ да гэтага не організавана шахматна-шаша… сэкцыя. Мы патрабуем ад Гарп… савету і Гарсавету фізкуль… прыняць рашучыя захады да… гортваньня шахматна-шашачна… ху і організацыі шахматна-ша… ных гурткоў на прадпрыемс… практыкуючы ў сваёй працы… выя шахматна-шашачныя спабор… твы рабочых, сустрэчы заво… каманд, растлумачальныя гутар… цэхах і інш.

Шахматна-шашачн… спаборніцтвы

Сакратарыят УсеЦСПС пастав… правесьці Усесаюзныя шахма… шашачныя спаборніцтвы ў маі…

У Менску гарадзкія шахма… шашачныя спаборніцтвы профс… ужо пачалі. Пакуль на першых… цох ідуць па шашкам: комсам… абутковай фабрыкі—тав. Шум… і майстар Гардон.

Імпэрыялістыя „гаспадараць" у колёніях

„Маладых расстрэльваць на месцы"—загадвае нанкінскі генэрал

(*Ліст з Пэйпіна*)

У гэроічных бойках чырвонай арміі і партызанскіх атрадаў, у савецкай перабудове вёскі, пяўсюду працоўная моладзь—адна з першых. Барацьбою маладых рабочых і сялян кіруе кітайскі комсамол. Утвораная кітайскім комсамолам падсобная організацыя—„маладая гвардыя", якая налічвае 1.600 тысяч маладых рабочых і сялян—асноўны рэзэрв для чырвонай арміі і партызанскіх атрадаў. У чырвонай арміі амаль палова байцоў—моладзь. Маладыя байцы часьцяком выконваюць самыя небясьпечныя заданьні. Нядаўна 5 маладых дазорцаў, заблудзіўшы, зашлі далёка ў тыл ворага. Аднак, яны не разгубіліся і павялі сярод сялян агітацыю. У свой корпус дазорцы вярнуліся разам з атрадам у 200 сялян і цэлай ротай белых салдат, якія перайшлі на бок чырвонай арміі. „Самыя харобрыя з маіх салдат—гэта моладзь" — заяўляе адзін з камандзіраў корпусу чырвоных войск.


Дзяўчаты і дзяўчынкі - піонэркі дапамагаюць чырвонай арміі стварыць мэдыцынскія пункты, праводзяць зборы продуктаў для чырвонаармейцаў, дапамагаюць сем'ям байцоў весьці гаспадарку. Часта нават 11-ці, 12-цігадовыя дзеці ідуць на позыцыі патроны, альбо пранікаюць ў тыл ворага для разьведкі і распаўсюджаньня пракламацый.

Нядаўна белыя каты засеклі на сьмерць пяцярых 12-гадовых хлапчукоў за распаўсюджаньне комуністычных лістовак. Ня гледзячы на катаваньні, ніводзін хлапчук не сказаў, хто даў ім гэтыя лістоўкі. Ня дзіва, што адзін з нанкінскіх генэраў аддаў загад па сваім палку: „маладых чырвонаармейцаў у палон ня браць, расстрэльваць на месцы".

Але рэволюцыйную моладзь не запалохаць драконаўскімі загадамі. Яна і далей будзе бясстрашна змагацца супроць белых генэралаў і кітайскай буржуазіі, якія разбурылі краіну шматлікімі войнамі, давялі працоўных да надзвычайнага жабрацтва і голаду. Маладыя рабочыя і сяляне будуць таксама беззаветна змагацца і супроць імпэрыялістых, якія падтрымліваюць Чан-Кай-Шы і ўсю яго чорнасоценую зграю.

Ен-Тай-Жэн

Эксплёатацыя дзіцячай працы ў Кітаі



На здымку: Кітаскія дзеці на цяжкай рабоце па пагрузцы цукровага чароту.

Жудаснае становішча працоўнага насельніцтва ў Інда-Кітаі

ПАРЫЖ. Орган „Лігі права чалавека" публікуе артыкул вядомага радыкала, профэсара Кале, аб становішчы тубыльцаў ва француская роўнікавай Афрыцы і ў Інда-Кітаі.

„З пачатку 20 стагодзьдзя,—піша Кале,—чужаземнае насельніцтва падпарадкавана рэжыму прымусовае працы, які можна параўнаць з нявольніцтвам, а ў некаторых адносінах быў куды горшы за нявольніцтва".

Кале зазначае, што землі, атрыманыя концэсіёнэрамі ад францускага ўраду, належалі мясцовым плямёнам. Концэсійныя кампаніі самі вызначылі цану на каўчук, які яны набываюць у чужаземцаў і плацяць у 5-6 разоў менш нормальнай цаны. Кампаніі аплочваюць працу насельніцтва не грашыма, а натурай, прычым расцэньваюць свае тавары утрая, учацьвера і нават узяцера вышэй у параўнаньні з рознічнымі цэнамі. Калі сяло адмаўляецца выканаць патрабаваньні кампаній, супроць яго організуюцца „карныя экспэдыцыі", якія зьбіваюць насельніцтва „ад мала да вяліка", падпальваюць памяшканьні разбураюць плянтацыі. Дзяржаўная таксама патрабуе ад чужаземцаў уплаты падушнага падатку, падатку каўчукам.

„Цікава апісаць,—гаворыць у заключэньні Кале,—мучэньні рабочых, экс лёатуемых на заводах і плянтацыях у Інда-Кітаі".

Адказны рэдакт…
МІХ. ПЛА…

Друкарня імя тав. Сталіна
Галоўлітбел № 599